**Шаўцова І.,**
студэнтка, гр. 313

# МІНІ-ГАБЕЛЕН

У багатай гісторыі выяўленчага мастацтва сабрана шматлікая колькасць разнастайных жанраў. На працягу стагоддзяў яны падзяляліся, зліваліся, набывалі новыя якасці. Увесь час мастакі вялі актыўныя пошукі ў розных накірунках дзеля павелічэння колькасці сродкаў выканання творчых задум. Адным з самых распрацаваных відаў выяўленчага мастацтва з'яўляецца габелен.

Габелен, ці па-старажытнаму шпалера, з'явіўся яшчэ каля трох з паловай тысячагоддзяў таму. Ён цесна звязаны з такім жанрам выяўленчага мастацтва, як жывапіс. Гэта плоскасны тканы дыван з сюжэтным адлюстраваннем, прамое пераймание жывапіснага палатна ці фрэскі. Як і жывапіс, габелен падзяляецца на станковы, які існуе ў прасторы як карціна (яго стылістыка не залежыць ад наваколля, яна замкнутая і мае свае, адметныя ад архітэктуры, якасці), і манументальны, які працягвае некаторыя прынцыпы пабудовы выяўленчай плоскасці фрэскі, такія як цэнтрычнасць кампазіцыі, поўная ці частковая сіметрыя, раўнавага мас, рознамаштабнасць, прамая ці адваротная перспектыва (паводле В. Савіцкай). Але з кожным годам асноўнае значэнне тэрміна "габелен" мянялася, яму надаваліся новыя рысы, пакуль ім не сталі лічыць рэч, выкананую з дапамогай разнастайных сродкаў і ў любой тэхніцы, асновай якой з'яўляецца перапляценне. Такім чынам, габелен стаў сінтэтычным сплавам, які ўвабраў у сябе некалькі відаў творчасці і ткацтва, жывапіс, скульптуру, сценапіс.

Сапраўднае нараджэнне сучаснага беларускага габелена звязана з работай А.М. Кішчанкі, які сумесна з мастакамі прыкладнога мастацтва Г. Гаркуновым і В. Бельцюковай стварыў першы значны твор "Чалавек, які спазнае свет". З гэтага пачынаюцца творчыя пошукі маладых беларускіх мастакоў.

У апошні перыяд развіцця габелена назіраецца імкненне да яго станкавізацыі. Цяпер значна пашырыліся дасягненні ў галіне міні-габелена. Упершыню міні-габелен паўстаў як акрэсленая з'ява на групавой выстаўцы мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва 1985 г. у Заслаўі.

Нарадзіўшыся з фрагментаў будучых манументальных габеленаў, узораў тэхнічнага выканання, фактурнага вырашэння задуманых кампазіцый, ён з'яўляецца вынікам самавызначэння мастака. Як від мастацкай творчасці нацыянальны міні-габелен адлюстроўвае характэрныя тэндэнцыі, уласцівыя і манументальнаму габелену, і змяшэнне відаў і жанраў. Адны мастакі звярнуліся да матэрыялаў і прыёмаў, уласцівых сялянскаму ткацтву, такіх як воўна, спрадзеная няроўнымі мяккімі ніцямі, каноплі, лён. Іншыя прытрымліваюцца класічнага пляцення, але і ў гэтым напрамку робяць сапраўды смелыя эксперыменты. Значна адрозніваецца ад манументальнага ткацтва і тэматыка міні-габеленаў. Габелен як жывапіснае палатно павінен быць тэматычным, несці сэнсавую нагрузку, мець прадуманае колеравае вырашэнне. Але гэта знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад яго памераў. Міні-габелены ў большасці сваёй арнаментальныя, дзе галоўнае — распрацоўка колеру ці фактуры. У творах шматлікіх мастакоў сюжэтнасць адышла ўбок і тэмай стаў сам матэрыял (спалучэнне матэрыялаў). Гэта можа быць і грубая паверхня, дзе ў якасці рэльефу ўводзяцца бавоўна, воўна, сінтэтыка, металічныя ніці, усялякія шнуры, нават конскі волас ці розныя металічныя і драўляныя рэчы.

Але ўвага некаторых вядомых мастакоў накіравана не толькі на форму, але і на змест. Сярод іх вылучаюцца габелены Я. Шунейкі і С. Свістуновіча сваім зваротам да значных гістарычных, грамадзянскіх тэм, нялёгкіх пры перадачы ў малых памерах.

Наогул міні-габелен не саступае класічнай манументальнай шпалеры. З кожным годам растуць яго значэнне, папулярнасць сярод прыхільнікаў, ён пачынае адыгрываць значную ролю ў фарміраванні эстэтычнага асяроддзя. Ён актыўна развіваецца і хутка, відаць, зможа спаборнічаць з манументальным габеленам.

Рэпазіторый БГУКІ